УДК 811.161.3'28

# ЛІНГВАГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЛЕКСІКІ РЫБАЛОЎНАГА ПРОМЫСЛУ Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

**М.М. Макарэвіч**
(Мазыр, Беларусь)

*Праводзіцца лінгвагеаграфічная характарыстыка лексікі рыбалоўнага промыслу ў нацыянальнай тэрміналогіі. Прааналізаваны намінацыі з народных гаворак, якія ўключаны ў склад сельскагаспадарчай тэрміналогіі.*

Разглядаемыя намі промыслы і рамѐствы (рыбалоўства, пчалярства, бондарства, ганчарства і кавальства) маюць прыблізна аднолькавую лакалізацыю на тэрыторыі Беларусі. Аднак геаграфічная шчыльнасць пашырэння кожнага асобнага промысла і рамяства мае значныя адрозненні. Аналізуемая промыславая лексіка распаўсюджана на ўсѐ й тэрыторыі Беларусі і ўваходзіць у склад усіх трох дыялектаў: паўднѐва-заходняга, паўночна-ўсходняга, а таксама сярэднебеларускіх гаворак.

Пэўная частка даследуемай лексікі ўвайшла ў склад навуковай тэрміналогіі, пры гэтым іх дыялектная прыналежнасць абумоўлена найперш тэрытарыяльным пашырэннем таго ці іншага промысла, рамяства.

Разглядаемыя промыслы і рамѐствы маюць у гэтым плане сваю спецыфіку, абумоўленую шэрагам фактараў, сярод якіх асноўны – тэрытарыяльнае пашырэнне таго ці іншага промысла, рамяства.

Спынімся на лексічным матэрыяле рыбалоўнага промыслу больш падрабязна.

Тэрытарыяльная распаўсюджанасць дыялектнай лексікі рыбалоўнага промыслу абумоўлена такім фактарам, як наяўнасць/адсутнасць водных аб'ектаў (рэк, азѐр і інш.) у той або іншай мясцовасці. У адпаведнасці з гэтым у розных дыялектах, дыялектных групах гаворак прадстаўлена розная колькасць лексічных адзінак, у тым ліку і тых, што ўвайшлі ў склад нацыянальнай навуковай тэрміналогіі.

Пры вызначэнні тэрытарыяльнай лакалізацыі выяўленай лексікі мы абапіраліся на дадзеныя, зафіксаваныя ў дыялектных слоўніках, лексічным атласе беларускіх народных гаворак, а таксама на ўласныя матэрыялы.

Для большай рэпрэзентатыўнасці фактычны матэрыял падаецца ў выглядзе табліцы.

*Табліца – Тэрытарыяльная лакалізацыя дыялектнай лексікі* ***рыбалоўства***

| Тэрміналагічная адзінка | Дыялектная адзінка | Дыялект | Група гаворак |
|---|---|---|---|
| *акунь* | *акунь* | паўночна-ўсходні<br>сярэднебеларускія | полацкая |
| *бляшня* | *бляшня* | паўднѐва-заходні | слуцкая |
| *браднік* | *браднік* | паўднѐва-заходні | мазырская |
| *валакуша* | *валакуша* | паўночна-ўсходні | полацкая |
| *верша* | *верша* | паўночна-ўсходні,<br>паўднѐва-заходні | усх.-<br>магілѐўская |
| *волак* | *волак* | сярэднебеларускія | |
| *восці* | *восці* | паўночна-ўсходні | полацкая |
| *вугор* | *вугор* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *вуда* | *вуда* | паўночна-ўсходні<br>сярэднебеларускія | полацкая |
| *вудзільна* | *вудзільна* | сярэднебеларускія | |
| *галавень* | *галавень* | паўночна-ўсходні<br>сярэднебеларускія | полацкая |
| *грузіла* | *грузіла* | паўднѐва-заходні | мазырская |
| *джгір* | *джгір* | паўднѐва-заходні | слуцкая |
| *ѐрш* | *ѐрш* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *жабры* | *жабры* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *жывец* | *жывец* | паўночна-ўсходні | полацкая<br>віцебская |
| *карась* | *карась* | паўднѐва-заходні<br>паўночна-ўсходні<br>сярэднебеларускія | мазырская<br>полацкая |
| *карп* | *карп* | паўднѐва-заходні | гродз.-баранавіц. |



МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | паўночна-ўсходні | полацкая |
| *кляваць* | *кляваць* | паўднѐ ва-заходні<br><br>паўночна-ўсходні | слуцкая<br>мазырская<br>полацкая |
| *кляпец* | *кляпец* | паўднѐ ва-заходні | слуцкая |
| *краснапѐрка* | *краснапѐрка* | паўночна-ўсходні | полацкая |
| *кручок* | *кручок* | паўночна-ўсходні<br>паўднѐ ва-заходні<br>сярэднебеларускія | полацкая<br>гродз.-баранавіц. |
| *лешч* | *лешч* | паўночна-ўсходні<br><br>паўднѐ ва-заходні | полацкая<br>віцебская<br>мазырская |
| *матня* | *матня* | <br>паўднѐ ва-заходні | гродз.-баранавіц.<br>мазырская<br>слуцкая |
| *мянтуз* | *мянтуз* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *невад* | *невад* | паўночна-ўсходні | віцебская, полацкая |
| *нераст* | *нераст* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *нераставаць* | *нераставаць* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *падсачак* | *падсачак* | сярэднебеларускія | |
| *паплавок* | *паплавок* | паўночна-ўсходні | полацкая<br>віцебская |
| *піскун* | *піскун* | паўночна-ўсходні | полацкая<br>віцебская |
| *плаўнік* | *плаўнік* | сярэднебеларускія | |
| *плотка* | *плотка* | паўночна-ўсходні<br><br>паўднѐ ва- | полацкая<br>усх.-<br>магілѐўская<br>мазырская |
| *пячкур* | *пячкур* | паўднѐ ва-заходні<br>сярэднебеларускія | слуцкая |
| *рыбалоў* | *рыбалоў* | паўночна-ўсходні | віцебская<br>усх.-магілѐўская |
| *сазан* | *сазан* | паўднѐ ва-<br>заходні | гродз.-баранавіц.<br>полацкая |
| *сом* | *сом* | паўночна-ўсходні<br>паўднѐ ва-заходні<br><br>сярэднебеларускія | полацкая<br>мазырская<br>гродз.-баранавіц.<br>палеская |
| *стронга* | *стронга* | сярэднебеларускія | |
| *стынка* | *стынка* | паўднѐ ва-<br>заходні | гродз.-баранавіц.<br>полацкая |
| *судак* | *судак* | паўднѐ ва-<br>заходні | мазырская<br>полацкая |
| *сцерлядзь* | *сцерлядзь* | паўднѐ ва-заходні | слуцкая |
| *уюн* | *уюн* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *чахонь* | *чахонь* | паўднѐ ва-заходні<br>сярэднебеларускія | слуцкая |
| *шчупак* | *шчупак* | ва ўсіх дыялектах | ва ўсіх групах |
| *яжгур* | *яжгур* | паўночна-ўсходні | полацкая |
| *язь* | *язь* | паўночна-ўсходні<br>сярэднебеларускія | полацкая |
| *ялец* | *ялец* | сярэднебеларускія | |

МГПУ им. И.П.Шамякина

Аналіз тэрытарыяльнай лакалізацыі ўключаных у навуковую тэрміналогію промыслававых адзінак дыялектнага паходжання дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Сярод выяўленых адзінак да паўночна-ўсходняга дыялекту адносіцца 41,4% лексем (*валаку́ша, піску́н, яжгу́р* і інш.), да паўднѐва-заходняга – 32,7% лексем (*бляшня́, брадні́к, кляпе́ц* і інш.), у склад толькі сярэднебеларускіх гаворак уваходзяць 25,9% лексем (*во́лак, плаўні́к, стро́нга* і інш.).

2. Промыславая тэрміналогія з галіны рыбалоўства сфарміравана пераважна на аснове паўднѐва-заходніх і паўночна-ўсходніх гаворак (74,1% ад агульнай колькасці аналізуемых лексем). Гэта ўяўляецца абсалютна заканамерным, улічваючы тэрытарыяльную лакалізацыю большасці водных аб'ектаў, і ніколькі не пярэчыць працэсу станаўлення і развіцця нацыянальнай літаратурнай мовы.

**Спіс крыніц фактычнага матэрыялу**


**АСХЖ** – Анаціраваны спіс хрыбетных жывѐл Беларусі: метад. рэкамендацыі / Мін. дзярж. пед. ін-т імя М. Горкага; уклад. А. Р. Александровіч. – Мінск: [б. в.], 1993. – 41 с.

**Бах.** – Баханькоў, А. З рыбалоўнай лексікі Полаччыны / А. Баханькоў// З народнага слоўніка / рэд.: А. А. Крывіцкі, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск, 1975. – С. 218–225.

**Бел.** – Белайчук, Т. З лексікі нараўлянскіх рыбакоў / Т. Белайчук // З народнага слоўніка / рэд.: А. А. Крывіцкі, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск, 1975. – С. 226–230.

**ДСБ** – Дыялектны слоўнік Брэстчыны / склад.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 294 с.

**ДСЗ** – Сцяцко, П. У. Дыялектны слоўнік: з гаворак Зэльвеншчыны / П. У. Сцяцко; навук. рэд. М.В. Бірыла. – Мінск: Выд. БДУ імя У.І. Леніна, 1970. – 184 с.

**ДСК** – Зайка, А. Дыялектны слоўнік Косаўшчыны / А. Зайка. – Слонім: Слонімская друкарня, 2011. – 272 с.

**ДСЛ** – Янкова, Т. С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны / Т. С. Янкова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 432 с.

**ДСМ** – Юрчанка, Г. Дыялектны слоўнік: з гаворак Мсціслаўшчыны / Г. Юрчанка; навук. рэд. А. А. Крывіцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 228 с.

**Касп.** – Каспяровіч, М. І. Віцебскі краѐвы слоўнік / М. І. Каспяровіч. – Віцебск: Выд-ва Віцеб. Акруговага Т-ва Краязнаўства, 1927. – 56 с.

**Крыв.** – Крывіцкі, А. Из словаря полесских рыболовов // Полесье: (лингвистика, археология, топонимика) / под ред. Н. И. Толстого, А. А. Кривицкого. – М., 1968. – С. 162–174.

**Крыўко** – Крыўко, М. Н. З рыбалоўнай лексікі Мѐршчыны / М. Н. Крыўко // Жывое наша слова: дыялектал. зб.: (да 90-годдзя чл.-кар. НАН Беларусі Ю. Ф. Мацкевіч); рэд.: Л. П. Кунцэвіч, І. Я. Яшкін. – Мінск, 2001. – С. 243–256.

**КСБТ** – Кароткі руска-беларускі слоўнік біялагічнай тэрміналогіі / склад. Т. М. Царэнка. – Віцебск: Віцеб. дзярж. пед. ін-т, 1994. – 76 с.

**КСУМ** – Бялькевіч, І. К. Краѐвы слоўнік усходняй Магілѐўшчыны / І. К. Бялькевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 512 с.

**ЛАБНГ** – Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5т. / пад рэд. М. В. Бірылы, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск: Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа, 1993. – Т. 1: Раслінны і жывѐльны свет. – 160 с.

**Лад.** – Ладны, Р. Малады рыбалоў / Р. Ладны. – Мінск: Белдзяржвыд., 1931. – 128 с.

**Матр.** – Матрунѐнак, А. П. Школа юнага рыбалова / А. П. Матрунѐнак. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1960. – 152 с.

**ММГ** – Матэрыялы для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак / пад рэд. М. А. Жыдовіч. – Мінск: Выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1977. – Вып. 3. – 144 с.

**НЖ-12** – Беларуская навуковая тэрміналогія: назвы жывѐл. – Мінск: Інбелкульт, 1926. – [Вып. 12]. – 72 с.

**ПСБТ** – Падручны руска-беларускі слоўнік біялагічных тэрмінаў / Беларус. дзярж. ун-т, Каф. беларус. мовы і літ. для прыродазнаўчых фак.; аўт.-склад.: І. Л. Бурак, Т. П. Піліповіч. – Мінск: БДУ, 1992. – 88 с.

**РБСГ** – Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі / Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа АН Беларусі / Г. У. Арашонкава, [і інш.]; пад рэд. М. В. Бірылы, Г. У. Арашонкавай. – Мінск, 1994. – 560 с.

**СБМН** – Насовіч, І. І. Слоўнік беларускай мовы / І. І. Насовіч. – Мінск: БелСЭ, 1983. – 756 с.

**СГТ-19** – Беларуская навуковая тэрміналогія: слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – [Вып. 19]. – 77 с.

**СЛТ-8** – Беларуская навуковая тэрміналогія: слоўнік лясных тэрмінаў. – Мінск: Інбелкульт, 1926. – [Вып. 8]. – 80 с.

**СПЗБ** – Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979 – 1986. – 5 т.

**ССГ-67** – Слоўнік па сельскай гаспадарцы (праект для абмеркавання) / Акад. навук БССР. Гал. рэд. Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. – Мінск: БелСЭ, 1967. – 127 с.

**Стан.** – Станкевіч, А. А. Лексіка народнай гаспадаркі ў гаворках Мазырска-Прыпяцкага Палесся: манаграфія / А. А. Станкевіч, А. М. Воінава, Л. М. Мінакова. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 312 с.

**СЦГ** – Слоўнік гаворак цэнтральных раѐнаў Беларусі: у 2 т. / уклад.: Е. С. Мяцельская [і інш.]; пад рэд. Е. С. Мяцельскай. – Мінск: Універсітэцкае, 1990. – Т. 1: А – П. – 287 с.

**Сцяшк.** – Сцяшковіч, Т. Ф. Слоўнік Гродзенскай вобласці / Т. Ф. Сцяшковіч; рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 671 с.

**ТС** – Тураўскі слоўнік: у 5 т. / склад.: А. А. Крывіцкі [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 1987. – 5 т.

**ТСБМ** – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5т. / пад агул. рэд. акад. К. Крапівы (К. К. Атраховіча). – Мінск: БелСЭ, 1977 – 1982. – 5 т.

**Ул.м.** – уласныя матэрыялы.

**Фядз.** – Фядзюшын, А. В. Спіс назваў птушак і некаторых рыб / А. В. Фядзюшын. – Мінск: Інбелкульт, 1925. – 196 с.

**Шат.** – Шатэрнік, М. В. Краѐвы слоўнік Чэрвеньшчыны / М. В. Шатэрнік; пад рэд. М. Я. Байкова і Б. І. Эпімах-Шыпілы. – Мінск: Выд. Беларус. акад. навук, 1929. – 317 с.

**ЭПБ** – Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. / пад рэд. І. П. Шамякіна [і інш.]. – Мінск: Выд-ва Беларус. сав. энцыкл. імя П. Броўкі, 1983 – 1986. – 5 т.

**ЭСГ** – Энцыклапедыя сельскага гаспадара / А. А. Аўтка [і інш.]; пад агул. рэд. Б. І. Сачанкі. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 1993. – 732 с.

**Явор.** – Яворскі, П. З лексікі рыбаловаў Мазыршчыны / П. Яворскі // Беларуская мова: міжведам. зб. / Гомел. дзярж. ун-т; гал. рэд. У. В. Анічэнка. – Мінск, 1980. – Вып. 7. – С. 70 – 76.

**Янк-1** - Янкоўскі, Ф. М. Дыялектны слоўнік / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1959. – [Вып. 1]. – 230 с.

**Янк-2** - Янкоўскі, Ф. М. Дыялектны слоўнік / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск: Выдва АН БССР, 1960. – [Вып. 2]. – 234 с.

**Янк-3** - Янкоўскі, Ф. М. Дыялектны слоўнік / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1970. – [Вып. 3]. – 172 с.




МГПУ им. И.П. Шамякина